# КОЛЕР НАСТРОЮ СВЯТОЧНЫ!

ЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

*Удзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства*

аважаныя сябры!

ардэчна віншую вас з Днём беларуска-ісьменства, які сёлета сабраў сяброў на вутай гомельскай зямлі — у гасцінным рушы.

этае свята стала сапраўды народным, сім-ам адзінства славян, умацавання духоўных тоўнасцяў, якія вучаць памятаць пра свае кі, шчыра любіць родны край і паважаць дкаў. Менавіта пісьменства з'ядноўвае мінулае, цяперашняе і будучыню, зберагаючы, як найвялікшы скарб, сувязь пакаленняў.

Беларусы заўсёды шанавалі пісьмовае слова, пачатак якому на нашай зямлі далі Еўфрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі і якое 505 гадоў таму Францыск Скарына аздобіў у друкаваную кнігу. Слаўныя традыцыі прод-каў-асветнікаў годна працягвалі Янка Купала і Якуб Колас, Максім Багдановіч і Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ і Іван Шамякін, на малой радзіме якога праходзіць мерапрыем-ства.

Непахісная вера, багатая культурная спад-чына і шчырае, таленавітае, праўдзівае слова здольныя захаваць згоду між народамі і да-раваць усім надзею на найлепшае. У гэтым перш за ўсё найвялікшае прызначэнне Дня беларускага пісьменства.

Жадаю ўдзельнікам і гасцям свята моцна-га здароўя, жыццёвай мудрасці, дабрабыту, натхнення і плёну ў працы, мірнага неба і аса-бістага шчасця.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



**Чацвёрты раз Гомельшчыне выпаў гонар прымаць удзель-нікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства. У розныя гады сталіцамі агульнанацыянальнага свята беларускага друка-ванага слова ў рэгіёне станавіліся Тураў, Хойнікі, Рагачоў. І вось цяпер Добруш — малая радзіма народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, цэнтр культурнага прыцягнення, дзе можна ацаніць усе знакавыя дасягненні нацыянальнай літаратуры, кнігадрукавання, гістарычнай навукі і асветніцкай дзейнасці, музейнай справы і нацыянальнай культуры ўвогуле.**

СТАР. 3







# КОЛЕР НАСТРОЮ — СВЯТОЧНЫ!

## МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ЗМЯНІЦЬ НЕЛЬГА

Святочныя пляцоўкі пачнуць працаваць сёння з 11 гадзін. На вуліцы князя Паскевіча разгорнуцца гандлёвыя рады, выстава-прэзентацыя турыстычнага патэнцыялу, «Паштовы павільён» і маладзёжная пляцоўка. У скверы непадалёк будзе арганізавана інтэрактыўная зона для дзяцей. На адкрытай пляцоўцы каля фантана падрыхтаваны лакацыі, якія прадставяць установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Гомельшчыны. У скверы на праспекце Міру разгорнуцца рамесныя рады, дзе можна купіць вырабы мясцовых умельцаў. Тут жа ўсе ахвотныя змогуць далучыцца да цырымоніі адкрыцця помніка ўраджэнцу Добрушскага раёна, вядомаму пісьменніку, сцэнарысту і драматургу — Івану Шамякіну.

## ВЕДАЙ ДОБРУШСКІХ!

Падрыхтаваліся здзівіць удзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства прадпрыемствы і арганізацыі горада. У паштовым аддзяленні № 4 адбудзецца цырымонія гашэння канверта з арыгінальнай маркай, прысвечанай XXIX Дню беларускага пісьменства.

Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» запрашае на экскурсіі па музейнай экспазіцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня свайго заснавання. Прадпрыемства таксама падрыхтавала выставачны павільён з поўнай лінейкай прадукцыі, у тым ліку і пісчай паперы, якую вырабляе з 1875 года.

Падчас свята можна ацаніць выставу вырабаў Добрушскага фарфоравага завода і набыць навінкі прадукцыі, выпушчанай спецыяльна да Дня беларускага пісьменства. Прадпрыемства запрашае гасцей на майстар-класы па роспісе посуду.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

У цэнтры горада каля мемарыяльнага комплексу «Памяць» рыхтуецца рэканструкцыя «Баі за Добруш 1943 года. Партызанскі супраціў», падрыхтаваная ваенна-гістарычным клубным аб'яднаннем «Гонар мундзіра». Рэканструкцыя — напамін аб падзеях 1943 года, якія папярэднічалі вызваленню Гомельскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут жа, на набярэжнай, разгорнецца мабільны музей «Дарога памяці» ад Беларускага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі Добрушскай сярэдняй школы № 1 можна ацаніць інтэрактыўную экспазіцыю «Памяць пакаленняў», сабраную музеямі баявой славы ўстаноў адукацыі Гомельшчыны.

## ЛІТАРАТУРНЫ БАМОНД

Пазнаёміцца з беларускімі пісьменнікамі і атрымаць аўтографы, паўдзельнічаць у паэтычных чытаннях, купіць кнігі, сувеніры, у тым ліку са зніжкамі, удзельнікі і госці Дня беларускага пісьменства змогуць на Фестывалі кнігі і прэсы. У сквер па праспекце Міру запрашаюць пляцоўкі самых розных літаратурных праектаў. Сярод іх — «Брыльянты стагоддзя» да 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, літаратурны салон пісьменнікаў Гомельшчыны «Святло каштоўнасцяў духоўных» і літаратурныя падворкі «Гомельшчына літаратурная», дзе пройдзе прэзентацыя найлепшых праектаў бібліятэк. Будзе прадстаўлены таксама выставачны праект «Песняры зямлі беларускай» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

На галоўнай плошчы горада з 20 да 22 гадзін адбудзецца святочны канцэрт і ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія».

## ТРАДЫЦЫІ СВЯТА

Святочнай службай у храме Свяціцеля Мікалая Цудатворца і хрэсным ходам удзельнікаў рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» працягнецца святкаванне Дня беларускага пісьменства ў Добрушы 4 верасня. Другі святочны дзень запросіць на прэзентацыю літаратурна-патрыятычнага праекта Саюза пісьменнікаў Беларусі «Бачу Беларусь такой».

## У ДАРОГУ З КЛАСІКАМІ

Дарэчы, у атмасферу Дня беларускага пісьменства дапаможа акунуцца транспарт, арганізаваны для падвозу ўдзельнікаў і гасцей святочнай праграмы. На лінію Гомель — Добруш накіраваны дызельцягнікі, упрыгожаныя цытатамі і партрэтамі вядомых беларускіх пісьменнікаў. «Літаратурны» трансфер дапаможа ў самы кароткі тэрмін дабрацца да Добруша і вярнуцца ў абласны цэнтр пасля заканчэння праграмы. Для зручнасці гасцей арганізаваныя таксама дадатковыя аўтобусы, якія будуць дастаўляць людзей з чыгуначнай станцыі ў райцэнтры. Добруш на Дні пісьменства арганізаваў і пяць паркоўак, дзякуючы якім прыехаць на свята ўсе ахвотныя могуць на ўласным аўтатранспарце. Іх размяшчэнне сінхранізуюць з рухам грамадскага транспарту, а напрамак руху да паркоўак укажуць дарожныя знакі. На ўсёй гарадской зоне правядзення святочных мерапрыемстваў і на пад'язных шляхах да горада, як з боку Гомеля, так і Расійскай Федэрацыі, арганізавана дзяжурства праваахоўнікаў. Супрацоўнікі ДАІ дапамогуць арыентавацца ў напрамку руху да святочных пляцовак. Дзяжурства будуць несці і дружыннікі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
*г. Добруш.*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***